УСТАНОВА “БЕЛАРУСКІ ДЗЯРЖАЎНЫ АРХІЎ-МУЗЕЙ ЛІТАРАТУРЫ І МАСТАЦТВА”

# КАЛЕКЦЫЯ ЛІЧБАВЫХ КОПІЙ ДАКУМЕНТАЎ Ф. НЕЎВАЖНАГА, ПОЛЬСКАГА СЛАВІСТА, МОВАЗНАЎЦЫ

**2018**

**ФОНД № 541**

**ВОПІС № 1**

**1949–2018 гг.**

**МІНСК 2024**

# ЗМЕСТ

**да воп. № 1 ф. 541**


| №№ | Назва раздзелаў | № спраў | № стар. воп. |
|---|---|---|---|
| | ПРАДМОВА | | |
| 1. | ДАКУМЕНТЫ Ф. НЕЎВАЖНАГА І ІНШ. | 1-19 | 1-3 |

## Прадмова

**Неўважны Фларыян** нарадзіўся 30 красавіка 1929 года ў горадзе Жылец (Польшча). У 1949 годзе паступіў на філалагічны факультэт Кіеўскага дзяржаўнага ўніверсітэта імя Тараса Шаўчэнкі (далей – КДУ) (спецыяльнасць – руская філалогія), дзе пазнаёміўся і пасябраваў з У.С. Караткевічам. У 1954 годзе паступіў у аспірантуру КДУ, дзе напісаў і абараніў кандыдацкую дысертацыю па творчасці У.У. Маякоўскага. Вярнуўся ў Польшчу, працаваў прафесарам Варшаўскага ўніверсітэта і Універсітэта Марыі Кюры-Складоўскай у Любліне. У 1983 годзе ўвайшоў у склад Нацыянальнай рады Таварыства польска-савецкага сяброўства. У студзені 2005 года ад прэзідэнта Украіны Віктара Юшчанкі атрымаў ордэн "За заслугі" III ступені (за папулярызацыю украінскай культуры ў свеце), у ліпені 2005 года стаў кавалерам Камандорскага крыжа Ордэна Адраджэння Польшчы. Памёр 24 красавіка 2009 года, пахаваны ў Варшаве на Павонзках.

Першую навуковую працу "Сатирическое изображение буржуазных дипломатов и политиков в произведениях Маяковского 1922–1923 годов" надрукаваў у час навучання ў КДУ. Пісаў артыкулы па беларускай літаратуры XX стагоддзя (у т.л. аб У.С. Караткевічу, Я. Коласе, Я. Купале і М. Танку). Уклаў і напісаў прадмову да зборнікаў "Włodzimierz Majakowski" ("Уладзімір Маякоўскі") (Варшава, 1965), "Antologia poezji ukraińskiej" ("Анталогія ўкраінскай паэзіі") (разам з Е. Плесняровічам) (Варшава, 1976), "Okno w nieskończoność: antologia opowiadań fantastycznonaukowych pisarzy radzieckich" ("Вакно ў бясконцасць: анталогія фантасмагарычных апавяданняў савецкіх пісьменнікаў") (Варшава, 1980), "Okno otwarte na sad. Antologia współczesnej poezji radzieckiej" ("Вакно, адчыненае ў сад. Анталогія сучаснай савецкай паэзіі") (Варшава, 1988) і інш. Пераклаў на польскую мову вершы да зборнікаў: "Na tej ziemi: poezja Białorusi, Rosji, Ukrainy: materiał repertuarowy Ogólnopolskiego Konkursu Recytatorskiego "Poezja i proza na wschód od Bugu" ("На той зямлі: паэзія Беларусі, Расіі, Украіны: рэпертуарны матэрыял Агульнапольскага конкурсу дэкламатараў "Паэзія і проза на ўсход ад Буга") (Варшава, 1996), "Янка Купала. Санеты: на беларускай, англійскай, іспанскай, нямецкай, польскай, рускай, украінскай, французскай мовах" (Мінск, 2002) і інш.

Дакументы Фларыяна Неўважнага (лічбавыя копіі на правах арыгінала) паступілі ў БДАМЛМ ад яго ўдавы – Станіславы Неўважнай – у выніку перапіскі з дырэктарам архіва-музея Г.В. Запартыка ў 2018 годзе. У выніку навукова-тэхнічнага апісання быў складзены вопіс № 1, у які ўвайшлі 19 спраў (219 дакументаў) за 1949–2018 гады.

Вопіс складаецца з аднаго раздзела, дзе прадстаўлены лісты Н. Артымовіч, Д.І. Бічэль-Загнетавай, Я. Брыля, А.Л. Вераб'я, У.М. Казберука, У.С. Караткевіча, А.І. Мальдзіса, І.П. Мележа, В.П. Райгошы і інш. да Ф. Неўважнага; дароўныя надпісы Я. Брыля і М. Танка Ф. Неўважнаму; фота Ф. Неўважнага з У.С.Караткевічам і інш.; дакументы жонкі і сына Ф. Неўважнага і інш. Справы

сістэматызаваны па намінальна-храналагічнаму прынцыпу за 1949–2018 гады. Лісты сістэматызаваны па алфавіце краін, унутры краін – па алфавіце прозвішчаў, лісты ад аднаго адраса – па храналогіі.

Прадмову склала
заг. аддзела В.Ф. Шаталава
05.06.2024

Установа "Беларускі дзяржаўны архіў-музей літаратуры і мастацтва"

ФОНД № 541
ВОПІС № 1
1949-2018

ЗАЦВЕРДЖАНА

Пратакол ЭМК БДАМЛМ
ад 11.06.2024
№ 7

| №№ п/п | Загалоўкі спраў | Крайнія даты | Коль-касць дак-ў | Колькасць файлаў / тэчак | Аб'ём на дыску, Мб |
|---|---|---|---|---|---|
| | **1. ДАКУМЕНТЫ Ф. НЕЎВАЖНАГА І ІНШ.** | | | | |
| | Лісты да Ф. Неўважнага | | | | |
| 1 | Лісты і паштоўкі Д. Бічэль-Загнетавай і Я. Брыля (27) да Ф. Неўважнага (на беларускай і польскай мовах).<br>Лічбавыя копіі | 1966-1985 | 28 | 85/29 | 26,8 |
| 2 | Лісты і паштоўкі Я. Брыля (на беларускай і польскай мовах).<br>Лічбавыя копіі | 1985-2005 | 29 | 86/29 | 37,1 |
| 3 | Лісты і паштоўкі А.Л.Вераб'я (4), У.М. Казберука, Б.К. Караткевіч (4) да Ф. Неўважнага (на беларускай, польскай і рускай мовах).<br>Лічбавыя копіі | 1974-1996 | 9 | 20/11 | 9,48 |
| 4 | Лісты і паштоўкі У.С.Караткевіча да Ф. Неўважнага. Малюнак У.С. Караткевіча з аднаго з лістоў да Ф. Неўважнага (чарнілы) (без даты).<br>Лічбавыя копіі | 1951-1957 | 27 | 103/27 | 79,4 |
| 5 | Лісты і паштоўкі У.С. Караткевіча да Ф. Неўважнага. Да ліста ад 5 траўня 1996 года прыкладзены малюнак і 3 фота У.С. Караткевіча, да паштоўкі ад 13 снежня 1971 года - 2 фота У.С. Караткевіча.<br>Лічбавыя копіі | 1958-1984 | 32/38 | 115/31 | 56,2 |
| 6 | Лісты і паштоўкі І. і Н. Кучкоўскіх (2), А.І. Мальдзіса (6), І.П. Мележа, С. Панюціч, Ю. Паталкова да Ф. Неўважнага (на беларускай, польскай і рускай мовах).<br>Лічбавыя копіі | 1969-2005 | 11 | 29/13 | 13,4 |
| 7 | Лісты і паштоўка В.П. Рагойшы (2), А.М. Сідарэвіча, М. Танка (2), Я.Я. Янушкевіча (2) (на беларускай, польскай і рускай мовах).<br>Лічбавыя копіі | 1966-1999 | 7 | 14/10 | 8,68 |
| 8 | Лісты Н. Артымовіч (2), С. Яновіча (2) да Ф. Неўважнага (на польскай мове) (Польшча).<br>Лічбавыя копіі | 1978-1999 | 4 | 7/4 | 4,62 |

***

| №№ п/п | Загалоўкі спраў | Крайнія даты | Колькасць дак-ў | Колькасць файлаў / тэчак | Аб'ём на дыску, Мб |
|---|---|---|---|---|---|
| 9 | Лісты Дзяржаўнага літаратурнага музея Янкі Купалы да Ф. Неўважнага з падзякай за пераклад санетаў паэта, Інстытута літаратуры імя Янкі Купалы АН БССР - з просьбай прыслаць лісты, атрыманыя ім (пры наяўнасці) ад І.П. Мележа, і інш. | 1980-2002 | 4 | 5/2 | 2,61 |
| | Дароўныя надпісы | | | | |
| 10 | Дароўныя надпісы Я. Брыля Ф. Неўважнаму на шмутцытулах сваіх кніг "Жменя сонечных променяў", "Ты жывеш" і інш. ад 07.11.1965 г. да 26.11.2005 г. (на беларускай і польскай мовах). Лічбавыя копіі | | 17 | 17/1 | 9,44 |
| 11 | Дароўны надпіс М. Танка Ф. Неўважнаму на шмутцытуле свайго зборніка вершаў "Лірыка" ад 12.11.1982 г. Лічбавая копія | | 1 | 1/1 | 0,46 |
| | Фотаздымкі Ф. Неўважнага і інш. | | | | |
| 12 | Фотаздымак Ф. Неўважнага, індывідуальны. Лічбавая копія | 1995 | 1 | 2/1 | 1,65 |
| 13 | Фотаздымкі Ф. Неўважнага ў групах з У.С. Караткевічам і іншымі аднакурснікамі ў час навучання ў Кіеўскім дзяржаўным універсітэце імя Тараса Шаўчэнкі. Лічбавыя копіі | 1949-1954 | 12 | 24/5 | 2,54 |
| 14 | Фотаздымкі Ф. Неўважнага ў групах з А.І. Мальдзісам, У.С. Караткевічам, былымі аднакурснікамі і інш. у Кіеве і Оршы. Лічбавыя копіі | 1972-1995 | 6 | 12/2 | 4,88 |
| | *** | | | | |
| 15 | Фотаздымкі У.С. Караткевіча і інш. з дароўнымі надпісамі Ф. Неўважнаму ад 1950 года да 1995 года (на беларускай, рускай і ўкраінскай мовах). Лічбавыя копіі | | 4 | 8/2 | 2,76 |
| | Дакументы іншых асоб | | | | |
| 16 | Лісты і паштоўкі У.С. Караткевіча да А. Неўважнага (сына) (3) і С. Неўважнай (жонкі) (10) (Польшча). Ліст У.С.Караткевіча да С. Неўважнай ад 31 студзеня 1958 года, напісаны ў працяг ліста Ф. Неўважнага да яе (на польскай мове). Лічбавыя копіі | 1956-1968 | 14 | 42/12 | 29,1 |

| №№ п/п | Загалоўкі спраў | Крайнія даты | Коль-касць дак-ў | Колькасць файлаў / тэчак | Аб'ём на дыску, Мб |
|---|---|---|---|---|---|
| 17 | Ліставанне БДАМЛМ з С. Неўважнай (Польшча) наконт перадачы ў архіў-музей дакументаў Ф. Неўважнага (на польскай мове). Дакументы, набраныя ў Word | 2017, 2018 | 2 | 2/1 | 0,064 |
| | *** | | | | |
| 18 | Фотаздымкі У.С. Караткевіча, індывідуальныя (5) і ў групах з Ко-Хуан-Енам, Ю. Ленарчыкам і інш. (2). Адзін фотаздымак - з дароўным надпісам У.С. Караткевіча А. Неўважнаму (сыну) ад 4 лістапада 1974 года. Лічбавыя копіі | 1951 - [пач. 1980-х гг.] | 7 | 11/2 | 3,11 |
| 19 | Фотаздымкі помнікаў У.С. Караткевічу ў Оршы і на Усходніх могілках Мінска і інш. Лічбавыя копіі | 1985-1992 | 4 | 8/1 | 2,96 |

У дадзены вопіс унесена 19 (дзевятнаццаць)
спраў з № 1 па № 19 , 219 дакументаў.

Вопіс склала і апрацоўку фонда зрабіла:

заг. аддзела ______________________ В.Ф. Шаталава

Дакументы прынялі:

загадчык аддзела забеспячэння захаванасці дакументаў ______________________ В.І. Бярэйшык

"_____"____________20____ г.